**Форум.** Урачыстае адкрыццё X Беларускіх Калядных адукацыйных чытанняў на тэму «80-годдзе Вялікай Перамогі: памяць і духоўны вопыт пакаленняў. Да 25-годдзя Саюзнай дзяржавы» адбылося ў Нацыянальнай бібліятэцы. З прывітальным словам да прысутных звярнуліся Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Веніямін, міністр інфармацыі Марат Маркаў ды іншыя. Вітальныя адрасы накіравалі Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля Качанава, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігар Сергяенка, Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі Дзмітрый Мезенцаў. На пленарным пасяджэнні дакладчыкі закранулі тэму духоўнага вопыту беларусаў у Вялікай Айчыннай вайне і ў пасляваенныя гады, пытанні памяці пакаленняў як духоўнага падмурка Саюзнай дзяржавы. Ва ўрачыстай абстаноўцы былі ўзнагароджаны пераможцы рэспубліканскага конкурсу «Кніга мне — кніга ўва мне».